Міністэрству замежных спраў Рэспублікі Беларусь
Міністэрству ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь
Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь

Зварот агульнага схода грамадскай арганізацыі "Беларусы Швецыі" ў сувязі з дзеяннямі, якія маюць рэпрэсіўны характар, у дачыненні да ўдзельнікаў мірных пратэстных акцый і затрыманняў журналістаў пры выкананні прафесійных абавязкаў у розных гарадах Беларусі

Мы, беларусы, якія жывуць у Швецыі, аб'яднаныя ў рамках грамадскай арганізацыі "Беларусы Швецыі", выказваем сваё глыбокае абурэнне і непрыманне дзеянняў службовых асоб і сілавых структур Рэспублікі Беларусь, звязаных з затрыманнямі і пакараннямі ўдзельнікаў шматлікіх мірных пратэстных акцый, у тым ліку, якія былі санкцыянаваны ўладамі, у розных гарадах Беларусі і затрыманнямі журналістаў пры выкананні імі працоўных абавязкаў.

У апошнія тыдні па ўсёй Беларусі ідуць масавыя мірныя пратэсты грамадзян, звязаныя з Дэкрэтам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №3 (далей па тэксце - Дэкрэт № 3) "Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», які сярод людзей атрымаў гучную назву "дэкрэт аб дармаедстве". Пратэсты, якія адбываюцца, носяць выключна мірны характар, не парушаюць правапарадак, не прадстаўляюць пагрозы нацыянальнай бяспецы, маральнасці, правам і здароўю іншых грамадзян. Карані дадзеных пратэстных дзеянняў грамадзян нашай краіны, якія прадстаўляюць самыя розныя сацыяльныя пласты і групы, відавочна заключаюцца ў істотным пагаршэнні эканамічнага становішча людзей, а таксама ў дыскрымінацыйным і зневажальным характары самога Дэкрэта №3.

У Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з артыкулам 41 Канстытуцыі «прымусовая праца забараняецца, акрамя работы або службы, якая вызначаецца прыгаворам суда або ў адпаведнасці з законам аб надзвычайным і ваенным становішчы». Згодна артыкула 33 Канстытуцыі "кожнаму гарантуецца свабода меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выказванне. Ніхто не можа быць прымушаны да выказвання сваіх перакананняў або адмовы ад іх. Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца». Артыкул 35 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кажа пра тое, што «свабода сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь, гарантуецца дзяржавай».

Дадзеныя дзеянні беларускіх уладаў надзвычай абвастраюць сацыяльную напружанасць, носяць рэпрэсіўны характар і істотна аддаляюць беларускае грамадства ад магчымасці канструктыўнага публічнага дыялогу па пытаннях сацыяльна-эканамічнай палітыкі. Замест таго, каб звярнуць увагу на зыходныя прычыны пратэстаў, наладзіць камунікацыю з рознымі групамі інтарэсаў у беларускім грамадстве з мэтай пошуку ўзаемавыгадных рашэнняў, улады краіны абралі шлях падаўлення незадаволенасці грамадзян. Такі падыход не спрыяе ўмацаванню ў нашым грамадстве атмасферы стабільнасці, бяспекі, даверу і павагі.

Мы заклікаем кампетэнтныя дзяржаўныя органы Рэспублікі Беларусь:

1) У самыя кароткія тэрміны вызваліць усіх арыштаваных і затрыманых з нагоды мірных выступаў у сувязі з Дэкрэтам №3, а таксама апратэставаць судовыя пастановы аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці ў дачыненні да гэтых людзей.
2) Неадкладна адмовіцца ад практыкі мер, якія маюць рэпрэсіўны характар, у дачыненні да грамадзян, у тым ліку грамадскіх актывістаў, палітыкаў, праваабаронцаў, іншых прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, якія мірна выказваюць свой пратэст.
3) Выявіць адказных за парушэнні канстытуцыйных правоў грамадзян і прыцягнуць іх да адказнасці, устаноўленай заканадаўствам. Прыняць меры па недапушчэнні ў будучыні парушэнняў канстытуцыйных правоў грамадзян і міжнародных абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь у галіне свабоды выказвання меркаванняў, сходаў, слова.
4) Спыніць затрыманні і іншыя меры, накіраваныя на перашкоду ў прафесійнай дзейнасці журналістам і незалежным СМІ.
5) Адмяніць Дэкрэт №3, як неадпавядаючы канстытуцыйным правам беларускіх грамадзян і беларускаму заканадаўству.
6) Усталяваць месца і фармат дыялогу прадстаўнікоў улады, працадаўцаў, прафсаюзаў і грамадзянскай супольнасці для вырашэння праблем беспрацоўя і забеспячэння асноўных канстытуцыйных, у тым ліку сацыяльна-эканамічных, правоў. Адказна прыступіць да такога дыялогу, забяспечыўшы паўнавартасны ўдзел усіх зацікаўленых бакоў.

Толькі разам, праз мірны канструктыўны дыялог, мы, беларусы, зможам выйсці са складанага сацыяльна-эканамічнага, палітыка-прававога крызісу на карысць беларускага народа!